# § 1. Унікальнасць чалавека

## Чалавек можа быць чалавекам толькі сярод людзей?

**Прыродная істота** ← Homo sapiens → **Сацыяльная істота**



### Псіхіка

Псіхіка — гэта ўласцівасць высокаразвітога галаўнога мозга, характэрная не толькі для чалавека, але і для іншых млекакормячых

### Свядомасць

Здольнасць узнаўляць рэчаіснасць у думках і вобразах, разумець тое, што адбываецца, і выстройваць на гэтай аснове свае паводзіны

### Рэакцыі і інстынкты

Мышачная, крывяносная, нервовая, выдзяляльная і іншыя сістэмы ёсць у жывёл

### Маўленне і зносіны

Працэс перадачы гукамі інфармацыі ад чалавека да чалавека, зносіны людзей з дапамогай мовы

### Адаптацыя

Прыстасаванне да навакольнага асяроддзя характэрна для ўсіх жывых арганізмаў (жывёл і раслін)

### Праца

Дзейнасць, накіраваная на задавальненне патрэб, стварэнне тэхнікі, пераўтварэнне навакольнага свету і самога сябе

### Інстынктыўныя паводзіны

### Мэтанакіраваная дзейнасць

**Індывід** — Сацыялізацыя → **Асоба**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Біялагічнае і сацыяльнае ў чалавеку.** У канцы XVIII ст. у лесе на поўдні Францыі паляўнічыя знайшлі дзіця, якое, мяркуючы па ўсім, жыло там адно. Сваім знешнім выглядам і паводзінамі хлопчык вельмі моцна адрозніваўся ад чалавечай істоты. Па сваіх схільнасцях і звычках ён нагадваў хутчэй дзікую жывёліну, чым чалавека. Адзін французскі вучоны выказаў меркаванне, што такія паводзіны дзіцяці — вынік вельмі ранняй і працяглай ізаляцыі ад іншых людзей. Вучоны быў упэўнены ў тым, што належнае навучанне і клопат дапамогуць дзіцяці вярнуцца ў грамадства і жыць нармальным паўнавартасным жыццём. Аднак праз некалькі гадоў вучоны прызнаў, што яго аптымізм не апраўдаўся. Віктора (так назвалі хлопчыка вучоныя) удалося навучыць некаторым навыкам зносін, ён мог вымаўляць асобныя словы. Але на гэтым поспехі скончыліся. Віктор так і не навучыўся падтрымліваць зносіны з людзьмі... Аналагічна было і з іншымі дзецьмі, якія здолелі выжыць па-за чалавечым грамадствам і якіх сталі называць «дзеці-маўглі» па імені галоўнага персанажа «Кнігі джунгляў» брытанскага пісьменніка Рэдзьярда Кіплінга.

Кім становяцца дзеці-маўглі ў дарослым жыцці?






Рэальныя гісторыі дзяцей-маўглі не маюць нічога агульнага з іх вобразамі ў мастацкай літаратуры і кінематографе. Назавіце вядомых вам легендарных персанажаў і выдуманыя гісторыі «дзікіх» дзяцей. Абмяркуйце магчымую прычыну папулярнасці гэтага сюжэта ў розных творах.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Чаму гісторыі рэальных дзяцей-маўглі, звязаныя са спробамі іх паўнавартаснага вяртання ў чалавечае грамадства, аказаліся няўдалымі? Усім вядома, што чалавек разумны (Homo sapiens) з’яўляецца неад’емнай часткай жывой прыроды. Як і любому біялагічнаму арганізму, яму ўласцівы самарэгуляцыя, абмен рэчываў, абмен энергіяй і інфармацыяй з навакольным асяроддзем. Але галоўная адметнасць чалавека — наяўнасць асаблівай *псіхікі*. Што ж такое псіхіка?

Псіхіка ўласціва толькі складанаарганізаваным жывым арганізмам, якія валодаюць як мінімум спецыяльнымі органамі ўспрымання інфармацыі (рэцэптарамі) і праводзячымі каналамі (нервовымі валокнамі). Напрыклад, у раслін няма псіхікі, хаця яны з’яўляюцца жывымі арганізмамі. У самых высокаразвітых арганізмаў ёсць орган назапашвання і перапрацоўкі інфармацыі — галаўны мозг. Адзінства гэтых элементаў складае нервовую сістэму жывога арганізма.

Псіхіка — асаблівая ўласцівасць чалавека або жывёлы суб’ектыўна адлюстроўваць падзеі аб’ектыўнай рэальнасці для арыентацыі і ўзаемадзеяння з навакольным асяроддзем. Інфармацыя, якую жывая істота атрымлівае пра навакольнае асяроддзе і свой унутраны стан, дазваляе ёй рэгуляваць уласныя паводзіны, дзякуючы чаму павышаюцца шанцы на выжыванне. Напрыклад, драпежныя птушкі, сабакі, сланы, дэльфіны і вышэйшыя прыматы могуць назапашваць індывідуальны вопыт на працягу ўсяго жыцця.

**Чым псіхіка чалавека адрозніваецца ад псіхікі жывёл?**




У думках апішыце прадстаўленую схему. Пра што яна? Прыдумайце для яе назву. Абмяркуйце апісанне схемы ў парах.

Запішыце вынікі, атрыманыя ў час абмеркавання дадзенай схемы. Ці характарызуюць гэтыя дзеянні чалавека як біялагічную істоту?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Як бачна, чалавечая псіхіка валодае асаблівымі якасцямі, якія вылучаюць нас у асобную катэгорыю жывых істот. Адной з вышэйшых псіхічных функцый галаўнога мозга чалавека з'яўляецца мысленне, вынікі якога становяцца даступнымі іншым людзям з дапамогай маўлення (вуснага і пісьмовага). Людзі дзеляцца сваімі думкамі і ўвасабляюць словы ў справы, узаемадзейнічаючы і пераўтвараючы ўмовы свайго існавання.

Такім чынам, чалавекам нас робіць тое, што мы набываем падчас свайго жыцця ад іншых людзей і грамадства ў цэлым. Працэс атрымання чалавечым індывідам навыкаў, неабходных для паўнавартаснага жыцця ў грамадстве, вучоныя абазначаюць тэрмінам *сацыялізацыя*. Менавіта дзякуючы сацыялізацыі мы становімся людзьмі.

**Індывід, асоба, індывідуальнасць.** Кожны чалавек як прадстаўнік біялагічнага віду мае пэўныя прыроджаныя асаблівасці. Яны праяўляюцца ў знешніх характарыстыках яго аблічча (колер вачэй і валасоў, пол, целасклад, прыроджаныя ўласцівасці асноўных сістэм арганізма і г. д.). Будова нашага цела абумоўлівае магчымасць прамахаджэння. Структура галаўнога мозга забяспечвае развіццё інтэлекту. Будова рукі, асабліва кісці, дазваляе выкарыстоўваць складаныя і разнастайныя прылады працы. Усе гэтыя прыметы адрозніваюць чалавечае дзіця ад дзіцяняці жывёлы.

Немаўля знаходзіцца ў самым пачатку шляху да таго, каб стаць асобай. Для гэтага яму неабходна многаму навучыцца. Пастаянна асвойваць патрэбныя для жыцця ў навакольным свеце ўменні і навыкі. Уключыцца ў культуру і грамадскія адносіны, набыць здольнасць дзейнічаць асэнсавана. Усвядоміць, што менавіта ён нясе адказнасць за сваё жыццё і лёс. Такім чынам, паняццем «асоба» падкрэсліваецца не толькі наша прыналежнасць да чалавечага роду, але і наяўнасць якасцей, якія сведчаць пра тое, што мы здольныя жыць сярод іншых людзей.

З'яўляючыся на свет як індывід, чалавек уключаецца ў складаную, разгалінаваную сістэму грамадскіх адносін. **Індывід**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(ад лац. *individuum* — непадзельны) — асобна ўзяты чалавек як носьбіт пэўных біялагічных уласцівасцей і якасцей. Сям'я, школа, сябры, іншыя значныя людзі, універсітэт, інтэрнэт, творы мастацтва, літаратура — можна вельмі доўга пералічваць усе крыніцы, якія ўносяць уклад у сацыялізацыю чалавека. У выніку гэтага ўздзеяння ён набывае адмысловую сацыяльную якасць — становіцца асобай.

**Асоба** — чалавек, які валодае сукупнасцю сацыяльных і духоўных якасцей, набытых ім у працэсе ўзроставага развіцця і сацыялізацыі.

**Я ўжо асоба ці яшчэ не? Якая я асоба?**

Прыметы асобы:

- чалавек, які засвоіў прынятыя ў пэўным грамадстве нормы і правілы;
- чалавек, які самастойна прымае рашэнні і адказвае за іх перад грамадствам;
- чалавек, які прымае ўдзел у жыцці грамадства і ўносіць уклад у яго развіццё.



Якія асацыяцыі ў вас узнікаюць са словам «асоба»? Ці можна лічыць асобай злачынцу або чалавека, які вядзе асацыяльны лад жыцця? Аргументуйце свой пункт погляду.

Кожная асоба індывідуальная. Пад **індывідуальнасцю** разумеюць адметныя біялагічныя, псіхалагічныя і сацыяльныя якасці чалавека, а таксама яго жыццёвы вопыт. Унікальныя падзеі жыццёвага шляху, праломленыя скрозь прызму гэтых якасцей, надаюць непаўторнасць кожнай асобе. І чым старэйшымі становяцца людзі, тым больш у іх адрозненняў, звязаных з індывідуальным, унікальным вопытам. Індывідуальнасць — тое, што вылучае чалавека з асяроддзя, адлюстроўвае яго непаўторнасць. Яна праяўляецца ў паводзінах, адносінах з іншымі людзьмі, выніках дзейнасці чалавека.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Ці магчыма з дапамогай кланіравання рэпрадуктаваць асобу?

Кланіраванне — гэта працэс або тэхналогія атрымання генетычна ідэнтычных або амаль ідэнтычных арганізмаў (клонаў).

**Дазволена:** кланіраванне клетак і тканак з даследчымі і медыцынскімі мэтамі.

**Забаронена:** любыя спробы кланіравання людзей.

(Дадатковы пратакол да Канвенцыі аб правах чалавека і біямедыцыне аб забароне кланіравання чалавечых істот.) ■

**Індывідуальнасць — непаўторнасць, унікальнасць і адметнасць вопыту канкрэтнай асобы. Не заўсёды гэта непаўторнасць даецца лёгка. Часта, ствараючы нешта новае, чалавеку даводзіцца пераадольваць перашкоды і бар'еры на шляху да пастаўленай мэты. Гэтыя выпрабаванні і цяжкасці дазваляюць яму набыць той самы вопыт, які падкрэслівае непаўторнасць яго жыццёвага шляху. Чалавек — гэта адзіная істота, здольная данесці да іншых сваю гісторыю, падзяліцца са слухачамі, пакінуць свой след у дзённікавых запісах, творах мастацтва, профілях сацыяльных сетак, відэазапісах.**




Сусветна вядомы беларускі пісьменнік Васіль Быкаў яшчэ ў юнацкім узросце спазнаў жахі і нягоды вайны, якія потым апісваў амаль ва ўсіх сваіх творах. Сваю творчасць ён прысвяціў маральнаму выбару, які чалавек робіць у драматычных абставінах. Сёння яго творы сталі класікай літаратуры XX ст.

Як вы думаеце, чаму серыя кніг мемуараў выдатных людзей называецца «Мая вайна»? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Свядомасць і самасвядомасць.** **Свядомасць** — гэта ўласцівая чалавеку здольнасць узнаўляць рэчаіснасць у думках і вобразах, разумець тое, што адбываецца, і выбудоўваць на гэтай аснове свае паводзіны. Свядомасць — неад'емная характарыстыка чалавека. Менавіта наяўнасць свядомасці дазваляе яму ўтрымліваць пастаянную сувязь паміж светам, у якім ён жыве, і сваімі дзеяннямі. Чалавек усведамляе тое, што адбываецца, толькі ў тым выпадку, калі можа перадаць гэта ў наступных пытаннях, адрасаваных сабе:

1) Што менавіта адбываецца?
2) Як да гэтага ставіцца?
3) Што мне рабіць?

Адна з важных уласцівасцей нашай свядомасці — гэта яе *актыўнасць*. Карціна свету, што паўстае перад намі, дзякуючы актыўнасці нашай свядомасці характарызуецца падзелам па ступені значнасці. Нешта больш важнае, актуальнае выходзіць на пярэдні план, адсоўваючы менш значныя падзеі на перыферыю. Чытанне цікавай кнігі можа дазволіць на пэўны час забыцца пра дрэннае самаадчуванне, прагляд вясёлага фільма дапамагае абстрагавацца ад сумных думак. Гэта значыць, што, акрамя актыўнасці, наша свядомасць вылучаецца *накіраванасцю*.

Яшчэ адной адметнай рысай свядомасці з'яўляецца здольнасць да *саманазірання*. У гэтым выпадку наша свядомасць накіравана на даследаванне нас саміх — нашых перажыванняў, самаадчування, стану, думак. Пры гэтым саманазіранне характарызуецца *крытычнасцю* — здольнасцю ацаніць сябе і свой стан па пэўных крытэрыях. У самым спрошчаным выглядзе крытычнасць — гэта здольнасць усведамляць адрозненні паміж «добрым» і «дрэнным». Такімі крытэрыямі для асобы з'яўляюцца яе ўласныя каштоўнасці і ідэалы.

*Самасвядомасць* — гэта ўсведамленне чалавекам самога сябе. Гэта важны працэс, які забяспечвае адзінства, цэласнасць і пастаянства асобы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Што можна сказаць пра людзей на карцінах як пра асоб? Ці адлюстроўвае аўтапартрэт самасвядомасць асобы?

  

Даведайцеся пра людзей, адлюстраваных на аўтапартрэтах (Вінсент Ван Гог, Аляксандр Ісачоў, Фрыда Кала). Чыя асоба зацікавіла вас найбольш? Чаму?

Самасвядомасць чалавека строга індывідуальная. Людзі могуць па-рознаму ацэньваць падзеі, якія адбываюцца, і свае ўчынкі, па-рознаму ставіцца да аб'ектаў рэальнага свету, адных і тых людзей. Пры гэтым кожнаму чалавеку ўласціва пэўная ступень суб'ектыўнасці ацэнкі, якая можа змяняцца ў залежнасці ад яго адносін да аб'екта, што ацэньваецца. Уменне крытычна ацэньваць сябе і свае адносіны да іншых людзей — важная рыса сталай асобы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Якія якасці чалавека маюць сацыяльную прыроду (узнікаюць толькі ў грамадстве)?
2. Запоўніце табліцу «Біялагічнае і сацыяльнае ў чалавеку».

| Біялагічнае | Сацыяльнае |
| --- | --- |
| | |

3. Чаму нельга атаясамліваць паняцце «асоба» з паняццем «індывід»? Прывядзіце не менш за тры аргументы.
4. Напішыце на аснове ўводнай інфаграфікі невялікі тэкст (на паўстаронкі) пра ўнікальнасць чалавека, выбраўшы адзін са стыляў тэксту (навуковы, мастацкі, размоўны, афіцыйны).
5. Стварыце сінквейн на тэму «Асоба».
Сінквейн — гэта верш з пяці радкоў, які мае пэўную структуру і складаецца з:
   - аднаго назоўніка, які з'яўляецца яго загалоўкам;
   - двух прыметнікаў або дзеепрыметнікаў;
   - трох дзеясловаў;
   - чатырох важных слоў, якія звязваюць усё ў адзінае цэлае;
   - аднаго слова-рэзюмэ.

   *Напрыклад:*
   Дзіця
   Маленькае, капрызлівае
   Нараджаецца, выхоўваецца, развіваецца
   Сэнс жыцця, радасць бацькоў
   Чалавек ■

Выканайце міні-праект «Асобы на аўтапартрэтах». Стварыце ўласную экспазіцыю — падборку выяў пяці асоб (карціны, фота, карыкатуры і да т. п.). Прадстаўце сваю экспазіцыю аднакласнікам. Растлумачце, чаму вы выбралі аўтапартрэты менавіта гэтых людзей. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне